*Н. І. Дожына*

# МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫ ПАДЫХОД У ВЫКЛАДАННІ САЛЬФЕДЖЫА

Дысцыпліна сальфеджыа з’яўляецца адной з асноўных вучэбных дысцыплін, прадугледжаных адукацыйным стандартам для падрыхтоўкі студэнтаў па ўсіх спецыяльнасцях факультэта музычнага мастацтва. Яна ўваходзіць у блок музычна-тэарэтычных дысцыплін, якія фарміруюць у студэнтаў веды, навыкі і ўменні, неабходныя для будучай прафесійнай дзейнасці. У станаўленні прафесійнага майстэрства інструменталістаў, вакалістаў, харавікоў як выканаўцаў і будучых педагогаў-выкладчыкаў сальфеджыа адыгрывае значную ролю. Заняткі сальфеджыа развіваюць музыкальны слых, памяць, адчуванне метрарытму і такія неабходныя для музыкантаў якасці, як навыкі дакладнага інтанавання па нотах і спеву з тэкстам, выразнага і асэнсаванага выканання твораў.

Вывучэнне сальфеджыа ажыццяўляецца ў цеснай сувязі з іншымі дысцыплінамі як музычна-тэарэтычнага цыкла – гармоніяй, аналізам музычных формаў, паліфаніяй, так і з дысцыплінамі спецыяльнага і агульнаадукацыйнага блокаў. Асобныя элементы гэтых дысцыплін, як нам падаецца, павінны быць натуральна ўключаны ў асобныя формы работы на занятках сальфеджыа, у чым выяўляецца міждысцыплінарная сувязь выкладаемых прадметаў ва ўніверсітэцкім курсе.

Беларускі фальклор, у тым ліку музычны, – адна з тых дысцыплін, вывучэнне якой прадугледжваецца для многіх спецыяльнасцей не толькі факультэта музычнага мастацтва, але і факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва і іншых факультэтаў[1]. Беларускі музычны фальклор – неад’емная частка адукацыйнага працэсу для студэнтаў спецыялізацый «спевы (народныя)», «народная музыка (харавая)», «інструментальная музыка (народная)», «фальклор». Веды з галіны

---

[1] Спецыяльнасці і спецыялізацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія вывучаюць дысцыпліны, звязаныя з беларускім фальклорам: ФТБКіСМ (спецыяльнасць 1-18 01 01 Народная творчасць, спецыялізацыі 1-18 01 01-05-03 Этнафоназнаўства, 1-18 01 01-05-01 Фальклор); ФММ (спецыяльнасць1-16 01 10 Спевы, спецыялізацыя 1-16 01 10-01 Спевы (народныя); спецыяльнасць 1-18 01 01 Народная творчасць, спецыялізацыі 1-18 01 01-05 Фальклор, 1-18 01 01-02 Інструментальная музыка (народная), 1-18 01 01-02 Харавая музыка (народная)).

беларускага музычнага фальклору неабходны і студэнтам шматлікіх іншых спецыяльнасцей, якія на першы погляд не маюць прамога дачынення да фальклору, але тым не менш, як паказвае практыка, спарадычна звяртаюцца да яго багацейшых глыбінных пластоў і чэрпаюць творчыя ідэі і нататкі.

Адной са спецыфічных асаблівасцей сальфеджыа ва ўмовах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з’яўляецца «няроўнасць» музычнай падрыхтоўкі студэнтаў розных спецыяльнасцей. У межах адной групы, дарэчы, нярэдка вучацца студэнты, якія паступаюць на базе музычных школ, вучылішчаў, каледжаў мастацтваў ці ўвогуле без спецыяльнай музычнай адукацыі. Задача ўніверсітэцкага курса сальфеджыа (гэтая дысцыпліна вывучаецца ўжо з першага курса) – не толькі «выраўнаваць» іх музычныя веды, але і паступова максімальна падымаць узровень падрыхтоўкі, улічваючы індывідуальныя асаблівасці кожнага студэнта.

Беларускія народныя песні – даступны і нескладаны матэрыял для спеву па нотах на першы погляд. Разам з тым гэта невычэрпна багаты аўтэнтычны пласт шматвяковай беларускай народна-песеннай культуры. Далучэнне да яе – не толькі пазнавальна, цікава і неабходна ўвогуле, але і заўсёды заахвочвае студэнтаў, прываблівае да калектыўнай творчасці.

Сальфеджыраванне песень па нотах і з тэкстам – улюбёная інтанацыйная форма работы на сальфеджыа. Студэнтам яна падаецца больш творчай справай, чым вучэбнай: яны раскаваныя, спяваюць свабодна, гучна і з душой. Немалаважна і тое, што настрой амаль ва ўсіх заўсёды ўздымаецца, і знаходзіцца шмат моцы і жадання для далейшых формаў работы. А тым не менш гэтая форма работы прывівае не толькі навыкі асэнсаванага і правільнага чытання з ліста пэўных узораў народных твораў, але і любоў да родных песень.

Спосабаў вывучэння і спявання народных песень на сальфеджыа шмат: сольна, невялікімі групкамі і хорам, чаргаванне сольных і ансамблевых, харавых спеваў (асабліва ў песнях дыялагічнага характару). Першапачаткова пажадана развучваць песні па нотах групамі ці хорам, пасля – са словамі ва ўказаным характары і тэмпе. З групамі высокага ўзроўню чытання з ліста можна спяваць адразу са словамі.

Збораў і метадычных дапаможнікаў, якія змяшчаюць беларускія, а таксама рускія, украінскія народныя песні, за шматгадовы перыяд

існавання кафедры тэорыі музыкі назапашана нямала. Сярод іх – песні адна-, двух- і шматгалосныя як аўтэнтычнага плана, так і ў апрацоўках знакамітых беларускіх кампазітараў і малавядомых музыкантаў[2]. Песні прадстаўляюць розныя гістарычныя пласты развіцця беларускай песеннай культуры, розныя функцыянальныя групы – каляндарныя, абрадавыя, лірычныя, палітычныя, рэвалюцыйныя, патрыятычныя і г.д., – песні, якія адыгрывалі вельмі значную ролю ў станаўленні і жыцці беларускай краіны.

Сярод тэматычных раздзелаў у тыпавой і вучэбных праграмах курса сальфеджыа, дарэчы, значацца тэмы, якія маюць непасрэднае дачыненне да музычнага фальклору: «Народна-ладавая дыятоніка»; «Геміёльныя лады». Гэтыя тэмы вывучаюцца, як бачна па назвах тэм, галоўным чынам у ладавым аспекце ў тэарэтычным і практычным кірунках. Напачатку неабходна давесці да студэнтаў інфармацыйныя звесткі пра разнастайнасць ладоў у народнай музыцы; ладаінтанацыйную будову песень раннетрадыцыйнага пласта з вузкааб’ёмным дыяпазонам напеваў і песень познетрадыцыйнага перыяду; пра песні, якія вытрыманы ў сяміступенных дыятанічных ладах (так званых «ладах народнай музыкі»), пентатанічных структурах, а таксама пра вельмі распаўсюджаную з’яву ў народнай песеннасці – ладавую пераменнасць. Усе тэарэтычныя звесткі абавязкова зацвярджаюцца на практыцы праслухоўваннем, аналізам і менавіта спевам саміх песень.

Заключным этапам вывучэння фальклорнага матэрыялу на сальфеджыа павінна стаць напісанне дыктанта як найвышэйшай і найскладанейшай формы навучання і засваення інтанацыйна-ладавых, рытмічных і формаўтваральных асаблівасцей народных песень. Пажадана выбіраць у якасці дыктанта вядомую народную песню (зыходзячы, канешне, з узроўню ведаў, навыкаў студэнтаў у гэтай справе). Невялікі папярэдні аналіз пабудовы і асноўных ладарытмічных момантаў, як і ў напісанні інструктыўных і розных іншых дыктантаў, таксама не пашкодзіць. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць рытмічнаму боку тых песень, якія змяшчаюць пераменныя метры, што, як вядома, даволі нярэдкая з’ява ў беларускім

---

[2] Сальфеджыо. Шматгалоссе на матэрыяле беларускай музыкі / скл. А. Смагін, Н. Шутовіч. – Мінск, 1994; Лещеня, Т. Сольфеджио на материале белорусской музыки / Т. Лещеня, Т. Титова. – Минск, 1996; Сальфеджыо: метад. дапам. для студэнтаў спецыялізацый Інстытута культуры (аднагалоссе на матэрыяле інструментальнай і вакальнай музыкі беларускіх кампазітараў XX ст.) / скл. А. Смагін, С. Чучалава. – Мінск, 1991; Сальфеджыа (на матэрыяле беларускіх народных песень): метад. дапам. для студэнтаў музычных спецыялізацый Інстытута культуры / скл. А. Смагін, Н. Галіцкая. – Мінск, 1992.

музычным фальклоры. Яны выклікаюць звычайна найбольшыя цяжкасці пры напісанні.

Беларускія народныя песні – вельмі зручны матэрыял для хуткага і лёгкага запамінання, што дае падставу выкладчыку выкарыстоўваць іх для так званых у сальфеджыстаў-практыкаў «дыктантаў па памяці». Запамінаць песню пажадана некалькімі спосабамі: пасля яе прапявання па нотах, пасля праслухоўвання яе са словамі ў выкананні іншых студэнтаў ці выкладчыка, але галоўным правілам павінна быць запамінанне яе цалкам ад пачатку да канца, асэнсаванне як адзінай мастацкай формы. Толькі пасля гэтага яе можна запісаць, выкарыстоўваючы, па жаданні, папярэдняе прайграванне на інструменце. Напрыканцы работы з дыктантам-песняй неабходна запісаць і яе славесны тэкст з выкарыстаннем спецыяльных прыёмаў вакальнай групоўкі працягласцей нот. Запісаная такім чынам песня, як нам падаецца, надоўга застанецца ў памяці, папоўніць слыхавы вопыт, пашырыць музыкальныя ўяўленні студэнтаў.

Навыкі работы з фальклорным песенным матэрыялам на сальфеджыа могуць прынесці карысць і ў іншых універсітэцкіх, пазаўніверсітэцкіх курсах і галінах дзейнасці творчых студэнтаў, напрыклад у фальклорна-этнаграфічнай практыцы, пры расшыфроўцы народных песень, а таксама ў іх асабістай кампазітарскай і выканальніцкай працы.